УДК 629.735

## Беларусы ва Украіне

Лойка Т.В.
Белорусский национальный технический университет

Гаварыць аб беларусах ва Украіне можна, на наш погляд, з 13-14 ст., калі ў ВКЛ склалася беларуская супольнасць з яе характэрнымі этнічнымі асаблівасцямі. Пасля таго як Українa была вызвалена з-пад татарскай няволі, пачалося паступовае засяленне сумежных тэрыторый і украінскіх стэпаў выхадцамі з Беларусі. Шмат беларусаў было і сярод удзельнікаў вызваленчага паўстання сяр. 17 ст. пад кіраўніцтвам Б. Хмяльніцкага. З прымусовых перасяленняў ва Украіну найбольш вядомым з’яўляецца Сурска-Літоўская слабада, заснаваная ў канцы 18 ст. каля Днепрапятроўска. Сюды па загаду Кацярыны ІІ былі вывезены суконныя заводы з Дуброўна Віцебскай вобласці з работнікамі і іх семьямі. У 19 ст. перасяленне беларускага насельніцтва на поўдзень было звязана з т.зв. ”уцекамі” прыгонных сялян у пошуках зямлі і волі. Асабліва інтэнсіўнымі былі міграцыйныя патокі ў савецкую эпоху. Па перапісу 1989 г. ва Украіне пражывала 440 тыс. беларусаў. Але ўжо у 2001 г. колькасць іх зменшылася да 275 тыс. Тлумачыцца гэта не толькі асіміляцыяй, але і рээміграцыяй на радзіму, абумоўленай матэрыяльнымі цяжкасцямі і няўпэўненасцю ў будучым .

Месцамі пражывання беларускай інтэлігенцыі ва Украіне традыцыйна былі гарады. Вядома, што ў свой час тут жылі і працавалі Ф. Багушэвіч, Э. Пашкевіч, М. Доўнар-Запольскі, Максім Багдановіч. У Кіеве у 1893 г. абараніў першую ў гісторыі дысертацыю па беларускаму мовазнаўству вядомы вучоны–славіст Я. Карскі. Вялікі ўклад унеслі таленевітыя беларусы ў развіцце эканомікі, навукі, культуры Украіны. Сярод іх даследчык Крыма А. Маркевіч, акадэмік І. Волчак, эканаміст В. Варона, інжынер-канструктар Я. Даўлюд, біелаг М. Юрахно і іншыя.

У маі 2000 г. быў створаны Усеукраінскі саюз беларусаў (УСБ), у склад якога ўваходзяць 19 рэгіянальных арганізацый. Актыўна працуюць грамадскія аб’яднанні беларусаў Адэсы, Львова, Чарнігава, Саюз беларусаў Крыма. Дзейнічаюць нядзельныя школы, мастацкія калектывы “Світанак”, “Палессе”, праводзяцца Дні беларускай культуры, выставы беларускіх мастакоў, вечарыны творчасці Я.Купалы і Я.Коласа і г.д. У в Шырокае пад Семфіропалем есць нават беларускі этнаграфічны музей. Мэтай сваей дзейнасці беларускія суполкі ва Украіне лічаць захаванне беларускай ідэнтычнасці, а таксама садзейнічанне развіццю і ўмацаванню беларуска- украінскіх культурных і эканамічных адносін.